ЗВЯЗДА
23 лістапада 1999 г.



АФІЦЫЙНА

# СЯРГЕЙ ЛІНГ СУСТРЭЎСЯ З УЛАДЗІМІРАМ ПУЦІНЫМ

**Актуальныя пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Расіі абмеркаваны ў час гутаркі прэм'ер-міністра нашай краіны Сяргея Лінга са старшынёй Урада Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным. Яна адбылася ў Маскве 22 лістапада, перад пасяджэннем Выканаўчага камітэта Саюза Беларусі і Расіі.**

Сяргей Лінг падзякаваў Уладзіміру Пуціну за разуменне і канструктыўны падыход да вырашэння шэрагу пытанняў эканамічнага супрацоўніцтва. Бакі абмеркавалі праблемы ваеннатэхнічнага і фінансавага ўзаемадзеяння, умовы разлікаў за пастаўляемыя энерганосьбіты, а таксама магчымасці рэалізацыі шэрагу сумесных праектаў.

Затым пачалося пасяджэнне Выканкама Саюза Беларусі і Расіі, на якім разглядаюцца больш чым 20 пытанняў. Старшынствуючыя — кіраўнікі ўрадаў дзвюх краін Сяргей Лінг і Уладзімір Пуцін. Былі акрэслены пазіцыі па праекту Дагавора аб саюзнай дзяржаве, ходу выканання рашэнняў Вышэйшага савета Саюза і Выканкама Саюза, рэалізацыі палажэнняў дагавора паміж Расіяй і Беларуссю аб роўных правах грамадзян. Абмяркоўваліся таксама праект бюджэту Саюза на 2000 год і балансы паліўна-энергетычных рэсурсаў дзвюх краін на наступны год. Акрамя гэтага, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА, на пасяджэнні падведзены вынікі ўсенароднага абмеркавання праекта Дагавора аб стварэнні саюзнай дзяржавы. У ім прынялі ўдзел больш чым паўтара мільёна грамадзян Беларусі і Расіі. Свае адносіны да дакумента выказалі звыш 50 заканадаўчых органаў суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, шэраг палітычных партый і рухаў, дзеячаў навукі, культуры і мастацтва. Па выніках пасяджэння падпісаны шэраг дакументаў.

**БЕЛТА.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ